**УА “Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў”**

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
**Загадчык кафедры культуралогіі**
**_____________А.І. Смолік**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ВУЧЭБНА–МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС
па дысцыпліне

# “МЕТОДЫКА ВЫКЛАДАННЯ КУЛЬТУРАЛОГІІ”

**Складальнік: ст. выкл. Вярбіцкая В.І.**

**Вучэбна-метадычны комплекс зацверджаны на пасяджэнні кафедры культуралогіі 25.09.2012 года, пр.№1**

**2012**

## Тлумачальная запіска

У сучасным навуковым мышленні склалася шырокая дыверсіфікацыя навук аб грамадстве. Кожная навуковая дысцыпліна мае свой прадмет вывучэння, г. зн. сферу пазнання, якая, безумоўна, не ахоплівае ўвесь аб'ект. Гэта адносіцца і да культуралогіі, якая вывучае грамадства ў іншым вымярэнні, у плане тых прынцыпаў і механізмаў дзейнасці і рэгуляцыі, якія ўваходзяць у духоўную сферу ва ўсёй разнастайнасці гэтага тэрміна. У сувязі з гэтым культуралогія ўведзена ў вучэбны працэс шэрагу гуманітарных ВНУ у якасці базавай вучэбнай дысцыпліны. У БДУ культуры і мастацтваў, дзе ажыццяўляецца падрыхтоўка выкладчыкаў і даследчыкаў праблем культуры, разам з выкладаннем комплекса культуралагічных дысцыплін будучыя культуролагі спасцігаюць назапашанны і сістэматызаваны і апрабіраваны метадычнай тэорыяй і практыкай вопыт. Вучэбная дысцыпліна “Методыка выкладання культуралогіі” уваходзіць у цыкл агульнапрафесійных і спецыяльных дысцыплін новага пакалення вучэбных планаў.

Дадзеная вучэбная праграма складзена з ўлікам змен адукацыйнай парадыгмы і вызначаецца стандартам вышэйшай прафесійнай адукацыі. Праграма адлюстроўвае ўнутраную логіку вывучаемых метадычных праблем, арынтуе будучых спецыялістаў на дзейнасць па аваладанню сучаснымі тэхналогіямі навучання і выхавання.

Мэтай вучэбнага курса “Методыка выкладання культуралогіі” з'яўляецца фарміраванне ў студэнтаў спецыялізацыі “тэорыя і гісторыя культуры” навыкаў і ўменняў, якія неабходны для рацыянальнай арганізацыі вывучэння культуралагічных дысцыплін як вучэбнага прадмета, а таксама для паспяховага вырашэння развіваючых і выхаваўчых задач.

Падчас выкладання дадзенай вучэбнай дысцыпліны вырашаюцца наступныя задачы:

- азнаямленне студэнтаў з тэарэтычнымі асновамі выкладання культуралагічных дысцыплін;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

- вызначэнне метадаў, сродкаў, спосабаў работы выкладчыка і навучэнцаў, з дапамогай якіх дасягаецца авалоданне культуралагічнымі ведамі, уменнямі і навыкамі, фарміруецца светапогляд, развіваюцца здольнасці навучэнцаў;

- выяўленне форм, відаў самаадукацыі і творчага пошуку;

- засваенне агульнадыдактычных прынцыпаў, метадаў і прынцыпаў выкладання;

- авалоданне сучаснымі адукацыйнымі тэхналогіямі арганізацыі вучэбнага працэсу па культуралагічных дысцыплінах.

У выніку засваення тэм вучэбнага курса студэнт павінен ведаць:

- змест і задачы методыкі выкладання культуралагічных дысцыплін;

- прафесійныя патрабаванні да выкладчыка культуралогіі;

- вучэбна-метадычны комплекс па культуралогіі;

- прынцыпы і метады выкладання культуралагічных дысцыплін;

- традыцыйныя і сучасныя адукацыйныя тэхналогіі арганізацыі вучэбнага працэсу па сацыяльна-гуманітарных дысцыплінах;

- каляндарнае, перспектыўнае і бягучае планаванне працы выкладчыка;

- спецыфіку працы з тэхнічнымі сродкамі навучання на занятках па культуралогіі;

- формы і віды пазааўдыторных заняткаў па культуралагічных дысцыплінах.

Студэнт павінен умець:

- канструяваць, аналізаваць і ажыццяўляць на практыцы працэс культуралагічнай адукацыі на ўроку і іншых відах заняткаў;

- састаўляць базы данных, рэпрадукцыі, выявы, схемы і табліцы для прэзентацыі на ўроках, лекцыях і семінарскіх занятках;

- планаваць урокі, падбіраць неабходны тэарэтычны і практычны матэрыял для раскрыцця вывучаемых працэсаў і з'яў культуры;

- арганізоўваць самастойную пазнаваўчую работу навучэнцаў;

- выкарыстоўваць нагляднасць на занятках па культуралогіі;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

- аналізаваць педагагічныя з’явы і супастаўляць з палажэннямі педагагічнай тэорыі;

- ажыццяўляць ідэалагічнае і эстэтычнае выхаванне навучэнцаў у працэсе педагагічнай дзейнасці.

*Метады (тэхналогіі) навучання*

Да эфектыўных педагагічных методык і тэхналогій, якія садзейнічаюць далучэнню студэнтаў да пошуку і выкарыстання ведаў, набыццю вопыту самастойнага вырашэння задач, адносяцца:

– тэхналогіі праблемна-модульнага навучання;
– тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці;
– праектныя тэхналогіі;
– камунікатыўныя тэхналогіі (дыскусіі, прэс-канферэнцыі, вучэбныя дэбаты і іншыя актыўныя формы і метады);
– метад аналізу канкрэтных сітуацый;
– гульнявыя тэхналогіі, у межах якіх студэнты ўдзельнічаюць у дзелавых, ролевых, імітацыйных гульнях, і інш.

Для кіравання вучэбным працэсам і арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці выкладчыкам рэкамендуецца выкарыстоўваць рэйтынгавыя, крэдытна-модульныя сістэмы ацэнкі вучэбнай і даследчай дзейнасці студэнтаў, варыятыўныя мадэлі кіруемай самастойнай працы, вучэбна-метадычныя комплексы.

У мэтах фарміравання сучаснай сацыяльна-асобаснай і сацыяльна-прафесійнай кампетэнцыі выпускніка ВНУ ў практыку правядзення семінарскіх заняткаў мэтазгодна ўкараняць методыкі актыўнага навучання, дыскусійныя формы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Назва тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | |
|---|---|---|
| | лекцый | Семінарскіх заняткаў |
| **Тэма 1.** Уводзіны. | 2 | |
| **Тэма 2.** Методыка выкладання культуралогіі як навукова-педагагічная дысцыпліна | 2 | 2 |
| **Тэма 3.** Прынцыпы і метады выкладання культуралогіі | 2 | 2 |
| **Тэма 4.** Тыпы і віды вучэбных заняткаў па культуралогіі | 4 | 4 |
| **Тэма 5.** Сучасныя адукацыйныя тэхналогіі арганізацыі вучэбнага працэсу па культуралогіі | 4 | 4 |
| **Тэма 6.** Планаванне працы выкладчыка (настаўніка) культуралогіі | 2 | 2 |
| **Тэма 7.** Аналіз тэкстаў навуковых прац айчынных і замежных культуролагаў, статыстычных матэрыялаў і сацыялагічных даследаванняў | 2 | 2 |
| **Тэма 8.** Факультатыўныя заняткі і асаблівасці іх правядзення | 2 | 4 |
| **Тэма 9.** Пазааўдыторная (пазакласная) самастойная работа па культуралагічных дысцыплінах | 2 | 2 |
| **Тэма 10.** Тэхнічныя сродкі навучання і іх выкарыстанне на занятках па культуралогіі | 2 | 2 |
| **Тэма 11.** Вучэбна-метадычны комплекс па | 2 | 2 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | |
|---|---|---|
| культуралогіі | | |
| **Тэма 12.** Педагагічнае майстэрства выкладчыка культуралогіі і шляхі яго ўдасканалення | 2 | |
| Разам... | 28 | 26 |

## ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

### Тэма 1. Уводзіны

Значэнне дысцыпліны "Методыка выкладання культуралогіі" ў падрыхтоўцы культуралагічных кадраў. Прадмет, змест, мэта і задачы, структура вучэбнага курса. Міжпрадметныя сувязі дадзенай дысцыпліны. Віды вучэбных заняткаў. Крыніцы інфармацыі па праблематыцы вучэбнай дысцыпліны. Формы кантролю.

Адметнасці вучэбных дысцыплін па праблемах фундаментальнай і прыкладной культуралогіі. Наяўнасць падручнікаў і адпаведнасць іх зместу адукацыйнаму стандарту і тыпавым праграмам. Праблемы выкладання культуралагічных дысцыплін. Аб'ектыўныя і суб'ектыўныя складанасці.

### Тэма 2. Методыка выкладання культуралогіі як навукова-педагагічная дысцыпліна

Рацыянальная арганізацыя вывучэння культуралагічных дысцыплін як вучэбных прадметаў, вырашэнне развіваючых і выхаваўчых задач – прызначэнне курса "Методыка выкладання культуралогіі".

Асноўныя раздзелы методыкі: агульныя асновы методыкі, метадычныя школы, погляды; прынцыпы і метады выкладання; сістэма вывучэння культуралагічных дысцыплін на розных відах заняткаў; сістэма самастойнай работы і яе разнастайнасць; шляхі, метады, прыёмы вывучэння культуралагічных дысцыплін; эмацыянальны і лагічны падыходы.

Міждысцыплінарны характар методыкі выкладання культуралогіі. Сувязь з педагогікай, псіхалогіяй, культуралогіяй, мастацтвазнаўствам, філасофіяй, сацыялогіяй, этнаграфіяй, рыторыкай і інш.

### Тэма 3. Станаўленне і развіццё методыкі выкладання культуралогіі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вытокі культуралагічнай адукацыі. Вылучэнне Л. Уайтам культуралогіі ў самастойную дысцыпліну ў комплексе грамадскіх навук. Выкладанне элементаў культуралагічных ведаў студэнтам гуманітарных факультэтаў у савецкіх ВНУ. Увядзенне культуралагічных дысцыплін у сістэму вышэйшай адукацыі ў 80-90-х гг. XX ст.

Першы дзяржаўны адукацыйны стандарт па культуралогіі ў Расіі (1992 г.). Стварэнне Вышэйшай школы культуралогіі ў Маскве (1995 г.).

Увядзенне культуралогіі як агульнаадукацыйнай дысцыпліны ў ВНУ Беларусі. Ліцэнзіі на права падрыхтоўкі культуралагічных кадраў у беларускіх вышэйшых навучальных установах.

Стварэнне вучэбных планаў і праграм па культуралагічных дысцыплінах.

Распрацоўка і выданне на постсавецкай прасторы вучэбнай і вучэбна-метадычнай літаратуры па культуралогіі (А.І. Арнольдаў, П.С. Гурэвіч, Г.В. Драч, Б.С. Ерасаў, Л.К. Кухто, І.Я. Левяш, У.Ф. Мартынаў, І.В. Марозаў, А.І. Смолік, І.Я. Шыршоў, В.Р. Языковіч і інш.).

**Тэма 4. Прынцыпы і метады выкладання культуралогіі**

Класіфікацыя метадаў у сучаснай метадычнай навуцы. Агульнадыдактычныя прынцыпы выкладання культуралогіі. Прынцып навуковасці. Прынцып даступнасці і сістэмнасці. Прынцып свядомай і актыўнай дзейнасці навучэнцаў пры вядучай ролі выкладчыка. Прынцып нагляднасці. Прынцып выхаваўчай накіраванасці.

Асаблівасці культуралагічнага аналізу літаратуры па праблемах матэрыяльнай і духоўнай культуры. Вывучэнне з’яў культуры і культурных працэсаў, яе фарміравання у онта-і філагенэзе. Прынцып параўнальнай культуралогіі.

Метады выкладання культуралогіі: метад творчага аналізу, эўрыстычны метад, даследчы метад, рэпрадуктыўны і прадуктыўны метады.

Асноўныя віды вучэбнай дзейнасці навучэнцаў у межах абазначаных метадаў: чытанне вучэбнай і манаграфічнай літаратуры, лекцыі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

канспектаванне пэўных тэкстаў, падрыхтоўка рэфератаў, складанне планаў і тэзісаў, складанне і каменціраванне табліц, схем. Падбор цытат і ўрыўкаў, выкананне дамашніх заданняў і інш.

### Тэма 5. Тыпы і віды вучэбных заняткаў па культуралогіі

Прынцыпы класіфікацыі вучэбных заняткаў па культуралогіі. Урок як калектыўная форма навучання. Віды ўрокаў па дадактычных мэтах: урок паўтарэнне; урок камбінаванай будовы; кантрольны урок.

Віды ўрокаў па вядучым метадзе: урок-гутарка; урок-дыскусія; урок-дыспут; урок-даследаванне; урок-доказ; урок-дэманстрацыя.

Віды ўрокаў па форме пазааўдыторнай працы: урок-алімпіда; урок-віктарына; урок-гульня; урок-турнір; урок-экскурсія.

Нетрадыцыйныя урокі: урок-прэзентацыя; урок-прэс-канферэнцыя; урок-інтэрв’ю; урок-турнір і інш.

Заняткі акдэмічнага тыпу: лекцыя, семінар, калоквіум, кансультацыя па курсавой працы, дыпломнай рабоце, магістэрскай дысертацыі.

Віды лекцый па дыдактычным прызначэнні: лекцыі па ўсяму курсу; уводная, разавая, установачная, падагульняючая, аглядная лекцыі.

Віды семінараў і практычных заняткаў.

Традыцыйная структура вучэбных заняткаў. Патрабаванні да сучасных відаў заняткаў.

### Тэма 6. Сучасныя адукацыйныя тэхналогіі арганізацыі вучэбнага працэсу па культуралогіі

Сутнасць і змест тэхналогіі навучання. Традыцыйная тэхналогія і яе кампаненты. Рэпрадуктыўна-інфармацыйны падыход як аснова традыцыйнай тэхналогіі. Настаўнік, падручнікі – крыніца ведаў, вучань – аб’ект.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Змяненне падыходаў да спосабаў актывізацыі мысліцельнай дзейнасці навучэнцаў. Эўрыстычна-даследчы, праблемны падыходы – аснова сучаснай тэхналогіі. Рэгулюючая функцыя кіравання пазнавальным працэсам. Стварэнне праблемных сітуацый, пабудова заняткаў па прынцыпе лагічных мысліцельных сітуацый. Алгарытмізацыя, распрацоўка і прымяненне апорных сістэм, сігналаў, выяў, табліц. Развіваючы характар сучасных тэхналогій.

Тэхналогія перспектыўных ліній: вылучэнне асобнай тэмы як скразнай лініі ў праграме па культуралогіі.

Тэхналогія модульнага навучання. Тэхналагічная карта вывучэння модуля. Модуль-блок. Рэйтынгавая ацэнка паспяховасці.

Дльтон-план і праца па ім. План-грнафік урокаў-заданняў, крокаў кансультацый і карэкцыі, выніковыя заняткі.

Французская майстэрня як лакальная тэхналогія. Разнастайнасць спосабаў працы. Адмаўленне ад бягучых ацэнак. Акцэнт на самастойную работу навучэнцаў.

Праектная тэхналогія і яе этапы: падрыхтоўка; плнаванне; даследаванне; аналіз інфармацыі; прэзентацыя; ацэнка і рэфлексія. Выкарыстанне мноства падыходаў.

**Тэма 7. Планаванне працы выкладчыка (настаўніка) культуралогіі**

Каляндарнае планаванне і яго віды: простыя і разгорнутыя. Перспектыўнае палнаванне і яго выкарыстанне пры вывучэнні манаграфічных прац па культуралогіі. Віды перспектыўнага планавання: тэматычна-паўрочнае, тэматычна-мэтавае.

Формы каляндарнага і перспектыўнага планавання.

Бягучае (паўрочнае) планаванне. Каляндарнае і тэматычнае планаванне як аснова будучага планавання.

Рабочыя планы і і х віды: план-канспект, тэзісны план, схематычны план. Распрацоўка рабочага плана на аснове праграмы. Структура узорнага рабочага плана па культуралогіі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Тэхналагаічная карта заняткаў па культуралогіі як частка перспектыўнага планавання.

## Тэма 8. Улік і ацэнка культуралагічных ведаў навучэнцаў

Віды ўліку ведаў: дзесяцібальная сістэма ацэнкі ведаў; пяціўзроневы падыход да ацэнкі ведаў.

Параметры ацэнкі ведаў навучэнцаў: будова адказу; змястоўнасць; навуковасць; арыгінальнасць; моўнае афармленне.

Бягучы ўлік. Абагульняючы ўлік. Індывідуальна-разавы ўлік.

Узроўні уліку ведаў навучэнцаў: рэцэптыўны; рэцэптыўна-рэпрадуктыўны; рэпрадуктыўна-прадуктыўны; прадуктыўны; прадуктыўна-творчы.

Тэсціраванне як від ацэнкі. Асноўныя патрабаванні да стварэння тэставых заняткаў.

## Тэма 9. Аналіз тэкстаў навуковых прац айчынных і замежных

культуролагаў, статыстычных матэрыялаў і сацыялагічных даследаванняў

Аналіз культуралагічных тэкстаў як частка вучэбных заняткаў. Навучальны і педагагічна арыентаваны характар аналіза. Мэтанакіраванасць аналізу.

Агульныя патрабаванні да аналізу тэарэтычных і эмпірычных матэрыялаў: узбагаціць новымі кльтуралагічнымі ведамі; фарміраваць аналітычныя уменні; развіваць камунікатыўныя навыкі; паглыбіць навуковае мысленне; развіваць навукова-даследчыя здольнасці; садзейнічаць выхаванню асобы.

Непасрэдныя патрабаванні: асэнсавана чытаць культуралагічны кантэкст; вызначыць асноўную сутнасць разглядаемай аўтарам праблемы; бачыць узаемасувязь культурнага працэса (з’явы) з сацыяльнымі, эканамічнымі і гістарычнымі ўмовамі.

Вызначэнне асноўных кірункаў аналізу: зместавы, структурны і тэхналагічны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Тыпавы парадак аналізу навуковых тэкстаў: чытанне навуковай працы; праверка правільнасці ўспрымання; слоўнікавая праца; складанне канспекта твора; уласна аналіз; падрыхтоўка тэзісаў; выступленне з інфармацыяй на занятках па выніках аналізу.

## Тэма 10. Факультатыўныя заняткі і асаблівасці іх правядзення

Факультатыў як эфектыўная форма навучання і выхавання навучэнцаў. Мэта факультатыва – паглыбляць і пашыраць веды па асобных тэмах ці праблемах функцыянавання культуры.

Патрабаванні да факультатыўных заняткаў: паглыбляць цікавасць да духоўнай і матэрыяльнай культуры. Фарміраваць і развіваць навыкі свядомага ўспрымання, з'яў і працэсаў, якія адбываюцца ў культуры; пашыраць, сістэмвтызаваць веды па праблемах фундаментальнай і прыкладной культуралогіі; развіваць крэатыўныя здольнасці і інтарэсы, аналітычныя ўменні.

Арганізацыя факультатыва: добраахвотны запіс навучэнцаў; уключэнне ў расклад, улік наведвання і паспяховасці; адзнака ў атэстаце (дыпломе).

Мэта, тэматыка факультатыва. Методыка правядзення факультатыўных заняткаў: падрыхтоўчы, галоўны і заключны этапы.

Формы працы на факультатыве: лекцыя, семінарскія заняткі, гутарка, дыскусія, навуковая канферэнцыя, камбінаваныя заняткі, напісанне навуковых рэфератаў і іх абмеркаванне.

## Тэма 11. Пазааўдыторная (пазакласная) самастойная работа па культуралагічных дысцыплінах

Замацаванне і паглыбленне аб'ёму ведаў па культуралогіі, вызначаных праграмай – мэта пазааўдыторнай працы.

Умовы эфектыўнасці пазааўдыторнай работы. Спалучэнне і лагічная звязанасць пазакласных заняткаў з паўрочнай працай.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Улік узроставых псіхалагічных асаблівасцей і адукацыйнага ўзроўню навучэнцаў. Даступнасць і займальнасць прапануеманга для самастойнай работы матэрыяла.

Формы пазааўдыторнай работы: масавая, групавая, камерная, індывідуальная.

Віды пазааўдыторнай самастойнай работы: пастаянная, цыклічная, эпізадычная.

## Тэма 12. Тэхнічныя сродкі навучання і іх выкарыстанне на занятках па культуралогіі

Сутнасць прынцыпа нагляднасці. Тэхнічныя сродкі навучання як сродак фарміравання абстракцыі. Назапашванне ўяўленняў аб артэфактах культуры ў працэсеу выкарыстання ТСН.

Праекцыя прадметнай і графічнай нагляднасці тэхнічнымі сродкамі навучання.

Патрабаванні да стварэння і афармлення графічнай нагляднасці: акуратнасць, разборлівасць, выразнасць, самадастатковасць. Графічныя формы арганізацыі матэрыялу.

Патрабаванні да выкарыстання нагляднасці.: адпаведнасць навучальнаму матэрыялу; якасная нагляднасць; колькасна і часова абмежавана; выкарыстанне ўсёй запланаванай нагдянасці.

Спецыфіка выкарыстання камп'ютэрных тэхналогій на занятках па культуралогіі.

## Тэма 13.Вучэбна-метадычны комплекс па культуралогіі

Паняцце "вучэбна-метадычны комплекс". Сродкі навучання і сістэматызаваная літаратура як кампаненты вучэбна-метадычнага комплексу (ВМК).

Нарматызныя дзяржаўныя дакументы па гуманітарных навуках у структуры ВМК. Вучэбная праграма па культуралогіі і яе роля ў арганізацыі вучэбнага працэсу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Падручнікі і хрэстаматыі па кльтуралагічных дысцыплінах і іх характарыстыка. Вучэбныя і вучэбна-метадычныя дапаможнікі па культуралогіі і іх выкарыстанне ў навучальным працэсе. Метадычны апарат падручнікаў.

Навуковыя дапаможнікі культуралагічнага кшталту. Літаратура для ажыццяўлення міжпрадметных сувязей. Ілюстрацыйны і дыдактычны матэрыял, тэхнічныя сродкі навучання. Метадычныя і кльтуразнаўчыя часопісы як эфектыўны сродак правядзення аўдыторных заняткаў і самастойнай работы навучэнцаў.

## Тэма 14. Педагагічнае майстэрства выкладчыка культуралогіі і шляхі яго ўдасканалення

Асоба выкладчыка (настаўніка) культуралагічных дысцыплін і яе якасці. Сацыяльная арганізацыя, ідэалогія і культура як фактары фарміравання асобы выкладчыка гуманітарных дысцыплін.

Гуманістычная накіраванасць прафесіі выкладчыка культуралогіі.

Агульнадыдактычныя патрабаванні да выкладчыка: валоданне дыялектычнымі асновамі каультуралагічных дысцыплін; засваенне агульных і спецыяльных метадаў перадачы культуралагічных ведаў; разуменне сутнасці культуралогіі, этапаў яе станаўлення, сучаснага стану, сувязі з іншымі навукамі і практыкай, авалоданне інавацыйнымі тэхналогіямі; высокія маральна-духоўныя якасці.

Спецыяльныя патрабаванні да выкладчыка культуралогіі: уменне данесці навучэнцам усё багацце сусветнай і айчыннай культуры; засваенне гісторыі нацыянальнай культуры; валоданне роднай мовай у яе вуснай і пісьмовай формах; трансліраванне культрурных традыцый беларускага народа; фарміраванне ўласнага погляду на з’явы і працэсы культуры.

Важнейшыя накірункі педагагічнай дзейнасці выкладчыка культуралогіі: даследчы, канструктарскі, арганізатарскі, камунікатыўны.

Формы павышэння кваліфікацыі выкладчыка культуралагічных дысцыплін.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Тематические и методические указания для семинарских занятий

Семинарские занятия строятся в соответствии с моделями, принятыми и отработанными высшей школой:

1. Семинар, предполагающий углубленное изучение курса и тематически прочно связанный с ним.
2. Семинар, предназначенный для основательной проработки отдельных наиболее важных и типичных в методологическом отношении тем курса или даже одной темы.
3. Семинар исследовательского типа с тематикой по отдельным частным проблемам науки
. для углубленной их разработки.

При изучении дисциплины «Методика преподавания культурологи» преимущественно используются вторая и третья модели, главным последняя: большинство семинаров строятся вокруг творческого процесса создания культурологического занятия.

**Форма семинарских занятий:**
- развернутая беседа по плану;
-небольшие доклады студентов с последующим обсуждением участниками семинара.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

-презентация разработанных занятий по культурологии
Возможно письменное выполнение задания ( реферат, эссе).

**Темы и задания к семинарским занятиям**

**Занятие 1.**

1. **Особенности преподавания теоретико-культурологических и историко-культурологических дисциплин.**
2. **Содержание культурологических дисциплин.**
3. **Культурная интуиция эпохи. Ведущий вид искусства.**
4. **Принципы историзма, научной объективности.**
5. **Категория художественной системы как исторически обусловленный тип художественного мироощущения.**

**Занятие 2.**

1. **Основы построения интегративного культурологического курса.**
2. **Поиск новых подходов к преподаванию дисциплин историко-культурологического блока.**
3. **Неразрывная связь курсов истории и культурологи, обществознания и культурологи.**
4. **Междисциплинарный подход к изучению культурологических дисциплин.**

**Занятие 3.**

1. **Занятия культурологического блока: сущность и своеобразие.**
2. **Структура занятия изучения нового материала.**
3. **Структура занятия формирования умений и навыков.**
4. **Структура занятия проверки знаний.**
5. **Структура повторительно-обобщающего занятия.**
6. **Структура комбинированного занятия.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

7. Интегрированные занятия как способ формирования целостного восприятия мира.
8. Работа с образцами - знакомство с художественными произведениями, конструирование, моделирование.

Занятие 4.

1. Нетрадиционные занятия культурологического блока: сущность и своеобразие.
2. Нетрадиционные формы занятий культурологического блока.
3. Игра как активная форма учебного занятия.
4. Признаки учебной игры.
5. Виды учебных игр.
6. Ретроспективные игровые задания.
7. Ролевые и не ролевые игры.
8. Оценка результативности игры.

Занятие 5.

1. Теоретические основания проблемного обучения культурологических дисциплин.
2. Сущность проблемного обучения.
3. Проблемное обучение как творческий процесс.
4. Суть проблемной интерпретации учебного материала.
5. Проблемная задача.
6. Психолого-педагогические цели проблемного обучения.
7. Формы проблемного обучения.
8. Исследовательская деятельность, метод проектов.
9. Виды дискуссий на занятиях культурологического блока.

Занятие 6.

1. Текст культуры, его интерпретация в курсе «Культурология».
2. Освоение навыков чтения и интерпретация текстов культуры.
3. Текст культуры, исторический текст, литературный текст.
4. Способы анализа текста.
5. Способы изображения текстовой информации.

Занятие 7.

1. Анализ живописного текста.
2. Принципы и параметры анализа художественного произведения.
3. Связь произведения с эпохой.
4. Первичные навыки семиотического анализа текста по Б.А. Успенскому на примере знаковой системы древнерусской иконы.
5. Символизм. Символические знаки изображения. Разные понимания смволизма. Эмблема.
6. Структура образа. «Вечные» идеи. Связи с другими образами художественной системы, сюжет, миф.
7. Процесс образования собственной картины как миротворчество.
8. Цвет символ как знак. Чистые цвета в живописи.
9. Концепция времени.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

10. Методика анализ живописного произведения.

Занятие 8.

1. Основы музейной педагогики и экскурсионного дела.
2. Предмет музейной педагогики.
3. Основы организации музейно-педагогических мероприятий: экскурсий, занятий, самостоятельной работы в научно-методических кабинетах.
4. Экскурсионное дело. Основные понятия: «экскурсия», «экскурсионный метод», «экскурсовод».
5. Классификация экскурсий.
6. Методика подготовки и проведения экскурсий.

Занятие 9.

1. Аудиовизуальные технологии обучения.
2. Психофизиологические основы восприятия аудиовизуальной информации человеком.
3. Аудиовизуальные технологии: фотография, оптическая проекция, звукозапись, телевидение и видеозапись и т.д.
4. Типология учебных видеозаписей.
5. Интерактивные технологии обучения.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Организация самостоятельной работы студентов**

Одной из форм организации работы студентов являются подготовка и написание самостоятельных работ – контрольных работ, рефератов, докладов. Это предполагает самостоятельное раскрытие, углубление и расширение в письменной форме проблем дисциплины "Методика преподавания культуралогіі" на основе использования рекомендуемой литературы, учебных и справочных материалов, научных статей, брошюр и монографий.

При этом виде деятельности студенты вырабатывают навыки самостоятельного углубленного изучения той или иной темы дисциплины "Методика преподавания культуралогии", формируют умения работать с книгой, первоисточником, библиотечным каталогом, учатся сопоставлять различные точки зрения, анализировать, обобщать, последовательно и логично излагать материал.

Вместе с тем самостоятельная работа является средством проверки знаний студентов, их умения работать самостоятельно, творчески. По ее содержанию можно судить о том, насколько глубоко студент усвоил изучаемый материал, как разобрался в использованной литературе, в какой помощи нуждается. Качество работы учитывается преподавателем при контроле знаний.

Работа должна быть выполнена аккуратно, со ссылками на изученную литературу, содержать выводы, список использованной литературы.

Вариант задания на самостоятельную работу выдается студенту индивидуально. Возможны некоторые вариации в теме работы (по желанию студента) и в соответствии с программой. Прежде чем приступить к написанию текста работы, следует сначала познакомиться с литературой по избранной теме. Лучше всего это сделать путем чтения учебных пособий, справочных изданий и рекомендованной литературы, освещающих те разделы культурологических наук, к которым относится конкретная тема. Выполняя работу, следует давать четкие ответы на поставленные вопросы. Совершенно недопустимо писать работу путем механического копирования отдельных мест из учебников, учебных пособий, брошюр и статей. Работа выполняется на основе самостоятельного, творческого использования рекомендованной литературы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ІНФАРМАЦЫЙНАЯ ЧАСТКА

### Літаратура

*Асноўная*

1. Аванесов, В.С. Форма тестовых заданий: учеб. пособие для учителей школ, лицеев, преподавателей ВУЗов и колледжей / В.С. Аванесов. – М.: 2005. – 156 с.

2. Грыцкевіч, С. Урок – фальклорны марафон / С. Грыцкевіч // Роднае слова. – 1995. – №9. – С. 84.

3. Дзесяцібальная сістэма ацэнкі ведаў. Прыкладныя нормы. – Мінск, НМЦэнтр, 2002. – С. 21.

4. Дубинина, А.П. Культурология: методические указания для самостоятельной подготовки студентов / А.П. Дубинина. – Могилев: Белорусско-Российский ун-т, 2004. – 25 с.

5. Лернер, И.Я. Дидактические основы методов обучения / И.Я. Лернер. – М.: Педагогика, 1981. – 186 С.

6. Фришман, И.И. Методика работы педагога дополнительного образования: Учеб. Пособие для студентов высш. пед. учеб. заведений. – 2-е изд., стер. / И.И. Фришман. – М.: Издательский центр «Академия». – 2004. – 160 с.

7. Языкович, В.Р. Культурология: методические указания / В.Р. Языкович. – Мн.: Бел. гос. Аграрный технический ун-т, 2005. – 23 с.

*Дадатковая*

1. Барыс, С. Праграма факультатыва па беларускім фальклоры (5-6 класы) / С. Брыс // Роднае слова. – 1990. – №10. – С. 52-56.

2. Бяспалы, А.А. Выяўленчае мастацтва Беларусі і сродкі яго адлюстравання / А.А. Бяспалы. – Мінск, 1994. – 128 с.

3. Выкарыстанне інавацыйных тэхналогій у арганізацыі дыстанцыйнага навучання студэнтаў-завочнікаў: матэрыялы навук. метад. канф. (2-3 лютага 1998 г.) / Рэдкал.: Смолік А.І. (адк. рэд) і інш. – Мн.: Беларускі ун-т культуры, 1998. – 198 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. Грыгаровіч, Я.Д. Прыкладная культуралогія: выучэб. дапам. для студэнтаў спецыяльнасці “культуралогія” устаноў, якія забяспечваюць атрыманне высш. адукацыі / Я.Д. Грыгаровіч, А.І. Смолік. – Мн.: Адукацыя і выхаванне. 2005. – 216 с.

5. Ляшук, В.Я. Урокі-семінары / В.Я. Ляшук // Роднае слова. – 1993. – №6. – С. 34-38.

6. Смолік, А.І. Культуралогія: тэорыя і гісторыя культуры: вучэб. дапам. / А.І. Смолік. Л.К. Кухто. – Мн.: Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2008. – 281 с.

7. Смолік, А.І. Культуралогія: гісторыя культуры: вучэб. дапам. / А.І. Смолік, Л.К. Кухто. А.А. Цобкала. – Мн.: 2009. – 310 с.

8. Сацыяльна-гуманітарныя навукі ў сістэме вышэйшай школы: Матэрыялы навук.-метад. канф. (5-6 лютага 2002 г.) / Рэдкал.: Смолік А.І. (адк. рэд.) і інш. Мн.: Бел. дзярж. ун-т культуры, 2002. – 242 с.

9. Шляхі павышэння эфектыўнасці кіруемай самастойнай работы струдэнтаў: Матэрыялы навук.-метад. канф. (14 лютага 2008 г.) / рэдкал.: Р.А. Ровіна (адк. рэд.) [і інш]. – Мн.: БДУ культуры і мастацтваў, 2009. – 218 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Пытанні да іспыту па курсу**
**«Методыка выкладання культуралогіі»**

Выкл. Вярбіцкая В.І.

1. Прадмет, змест, мэта і задачы, структура вучэбнага курса” Методыка выкладання культуралогіі”. Асаблівасці выкладання тэарэтыка-культуралагічных дысцыплін..
2. Методыка выкладання культуралогіі як навукова – педагагічная дысцыпліна.
3. Станаўленне і развіццё методыкі выкладання культуралогіі.
4. Прынцыпы і метады выкладання культуралогіі.
5. Тыпы і віды вучэбных заняткаў па культуралогіі.
6. Віды ўрокаў па дыдактычных мэтах.
7. Віды ўрокаў па вядучым метадзе.
8. Віды ўрокаў па форме пазааўдыторнай працы.
9. Нетрадыцыйныя ўрокі па культуралогіі.
10. Заняткі акадэмічнага тыпу па культуралогіі.
11. Сучасныя адукацыйныя тэхналогіі арганізацыі вучэбнага працэсу па культуралогіі.
12. Французкая майстэрня як лакальная тэхналогія.
13. Планаванне працы выкладчыка (настаўніка культуралогіі). Улік і ацэнка культуралагічных ведаў навучэнцаў.
14. Аналіз тэкстаў навуковых прац айчынных і замежных культуролагаў, статыстычных матэрыялаў і сацыялагічных даследаванняў.
15. Факультатыўныя заняткі і асаблівасці іх правядзення.
16. Пазааўдыторная (пазакласная) самастойная работа па культуралагічных дысцыплінах.
17. Суадносіны формы і зместу лекцый па культуралогіі як метадычная праблема.
18. Педагагічнае майстэрства выкладчыка культуралогіі і шляхі яго ўдасканалення.
19. Тэарэтычныя асновы праблемнага навучання фундаментальнай культуралогіі.
20. Семінар як форма арганізацыі навуковага працэсу.
21. Вучэбна-метадычны комплекс па культуралогіі.
22. Тэхнічныя сродкі навучання і іх выкарыстанне на занятках па культуралогіі.
23. Выкарыстанне праектнай тэхналогіі ў выкладанні культуралагічных дысцыплін.
24. Выкарыстанне своеасаблівых метадаў і прыёмаў у выкладанні культуралогіі.

Загадчык кафедры культуралогіі А.І. Смолік

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН ВУЧЭБНАГА КУРСА “МЕТОДЫКА ВЫКЛАДАННЯ КУЛЬТУРАЛОГІІ”

| Назва тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | |
|---|---|---|
| | лекцый | Семінарскіх заняткаў |
| **Тэма 1.** Методыка выкладання культуралогіі як навукова-педагагічная дысцыпліна | 2 | 2 |
| **Тэма 2.** Тыпы і віды вучэбных заняткаў па культуралогіі | 2 | 2 |
| **Тэма 3.** Сучасныя адукацыйныя тэхналогіі арганізацыі вучэбнага працэсу па культуралогіі | 2 | 2 |
| **Тэма 4.** Факультатыўныя заняткі і асаблівасці іх правядзення | 2 | 2 |
| Разам... | 8 | 8 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ